7. Тарановский, Ф.В. Обзор памятников магдебургского права западно-русских городов литовской эпохи: Историко-юридическое исследование /Ф.В.Тарановский. - Варшава: Типография Варшавского учебного округа, 1897. – 201 с.
8. Тарановский, Ф.В. Феодализм в России /Ф.В.Тарановский. - Варшава: Типография Варшавского учебного округа,1902. - 53 с.
9. Тарановский, Ф.В. Энциклопедия права: Учебное пособие /Ф.В.Тарановский. - СПб.: СПб.Университет МВД, 2001. – 552 с.
10. Тарановский, Ф.В.. История русского права: Сб.статей /Ф.В.Тарановский /Под ред. В.А.Томсинова. - М.: Зерцало, 2014. – 223 с.
11. Томсинов, В.А. Правовая мысль русской послереволюционной эмиграции. Статья 6-я: Федор Васильевич Тарановский: судьба и творчество/ В.А.Томсинов // Законодательство. - 2003. - № 4. - С.87–90; № 5. - С. 87–91.
12. Усенко, І.Б. Академік Ф.В.Тарановський / І.Б Усенко. // Правова держава. Київ, 1993. - Вип.4. - С.130-143.

## ЭГА-ДАКУМЕНТЫ РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ СВЯТАРОЎ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIX–XX СТСТ. (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ)

К.В. Сыцько (Мінск, Беларусь)

У шмат якіх парафіях Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі на сённяшні момант захаваліся каштоўныя гістарычныя крыніцы наратыўнага характара. Яскравым прыкладам такіх дакументаў можна назваць эга-дакументы парафіяльных ксяндзоў пробашчаў, вікарыяў, магістраў і г. д. Сярод дадзеных гістарычных крыніц асабліва выдзяляюцца асабістыя дзённікі, успаміны і мемуары; персанальныя малітоўнікі і брэвіарыі; ліставанне; канспекты гамілій і шмат інш.

Калі аналізаваць якасна-колькасныя паказчыкі эга-дакументаў сярод усяго комплекса крыніц парафіяльных архіваў, то трэба адзначыць іх невялікую колькасць, нерэгулярнасць, адсутнасць сістэмы, якая б уніфікавала і стандартызавала запісы. Так, з усяго масіва дакументаў Лідскага Фарнага касцёла (іх налічваецца каля 100 адзінак), да эга-дакументаў адносіцца некалькі аркушоў ліставання кс. Станіслава Каласанты Роека з прыхаджанамі, а таксама мемуары кс. Гіпаліта Баярунца [6], а сярод дакументаў Селіванаўскай парафіі крыніц дадзенага тыпа не выяўлена наогул. Варта адзначыць, што большасць дакументаў дадзенага тыпа, якія знаходзяцца ў парафіяльных архівах, датуюцца XIX – XX стст., знаходкі за ранейшы час па ўсёй Беларусі маюць адзінкавы характар.

У шэрагу найбольш цікавых мемуараў, дзённікаў і ўспамінаў можна выдзеліць дакументы, якія пакінулі пасля сябе ў парафіях, у якіх служылі, кс. Гіпаліт Баярунец і Станіслаў Каласанты Роек (абодва з Лідскага Фарнага Касцёла), Ян Мяноўскі (з касцёла ў Вялікай Рагозніцы), Рамуальд Дроніч (з касцёла ў Валкалаце), Францішак Рошак (з касцёла ў Крупава) і шмат інш. Пры аналізе дадзеных крыніц можна казаць аб тым, што сярод іх існуе некалькі падвідаў: а) дакументы, якія ствараліся “для памяці” – дзённікі з запісамі аб паездках, сакрамэнтах, леках і г. д. ; б) мемуарыстыка.

Да першага падвіда крыніц, дастаткова статычных у сваёй інфармацыйнай вартасці, можна аднесці дзённік ксяндза з Валкалацкай парафіі Рамуальда Дроніча, які называецца “Zapisy leczyć. Recepty”. Дадзены дакумент быў знойдзены падчас археаграфічнай экспедыцыі аўтара на касцельным гарышчы і яго атрыбуцыя выклікала некаторыя цяжкасці: адсутнічалі подпісы, даты і г. д. Аднак у самой крыніцы былі знойдзены выразкі з газет часоў ІІ Рэчы Паспалітай, а таксама закладкі на пэўных старонках з пазначэннем вялікай колькасці прозвішчаў. Параўнанне напісання шэрага літар у дзённіку з атрыбутаванымі дакументамі 1921 – 1939 гг. дало магчымасць казаць аб тым, што аўтарам з’яўляецца менавіта кс. Р. Дроніч. Пры апытанні старэйшых парафіян касцёла Св. Яна Хрысціцеля, яны паццвердзілі, што кс. Дроніч займаўся стварэннем лекаў (пераважна на аснове траваў), за што быў паважаны мясцовымі жыхарамі [10]. Спалучэнне г. зв. “вуснай гісторыі” з распалажэннем закладак і выразак з газет у дзённіку, зверка прозвішчаў на закладках з прозвішчамі ў кнізе перадшлюбных экзаменаў за канец 1930-ых гг. [9, арк. 51 – 59адв.], раскрывае такія бакі паўсядзённага жыцця, як хваробы парафіян, узровень давера да мясцовага святара (да якога падчас хвароб звярталіся вельмі часта).

У сваю чаргу, мемуары і ўспаміны святароў з’яўляюцца больш дынамічнай крыніцай і ўяўляюць сабой адлюстраванне гістарычнай рэальнасці скрозь прызму асабістых і рэлігійных уяўленняў. Пры гэтым дадзеныя ўяўленні змяняліся ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі. Так, кс. Г. Баярунец напрыканцы XIX – напачатку XX ст. атаясамляў пытанне веры з нацыянальнасцю, спрабуючы падкрэсліць патрыятызм рыма-katалікоў і касмапалізм праваслаўных і іўдзеяў [6, арк. 14]. Па словах кс. Баярунца, ён “…вырываў моладзь з габрэйскіх рук…”, а рыма-каталікі з дому састарэлых у Валожыне сышлі з яго і пехам ішлі ў Ліду толькі таму, што ўладальніца ўстановы была праваслаўнага вызнання [4, с. 32]. Пры гэтым, ва ўспамінах жыхароў Ліды дадзены святар атрымліваў эпітэт як мінімум “слыннага і шанаванага” [15, с. 22]. Кс. С. Роек і Я. Мяноўскі, у сваю чаргу, займаліся душпастырствам у другой палове XX ст., таму іх успаміны прасякнутыя гісторыямі пра ціск на касцёл у БССР. Так, паводле кс. Роека, цывільныя ўлады ў 1950-я – 1970-я гг. забаранялі яму праводзіць набажэнствы, на яго жыццё было здзейснена тры замахі [14, с. 60], цывільных прыхаджан пужалі, забіралі рэлігійныя кнігі і абразы, у самога святара канфіскавалі гарод памерам 0,15 га [8, арк. 21, 23]. Падчас апытання жыхароў дамоў, якія знаходзяцца побач з Фарным касцёлам у Лідзе, аўтару быў перададзены ІІ том Святога Пісання 1888 г. выдання, які быў знойдзены завёрнутым у ганучу на гарышчы набытага прыватнага дома. У працэсе



Репозиторий ВГУ

аналіза кнігі на адваротным баку гравюр былі знойдзены фрагменты дзённіка неўстаноўленай асобы за 1950-я – 1960-я гг. [7, арк. 144]. Запісы дзённіка ўскосна пацвердзілі ўспаміны кс. Роека. Апісанне ціска на святарства, аздобленае замалёўкамі з цывільнага жыцця, паказвае асабістыя чыннікі ксяндзоў і асаблівасці іх характара. Так, негледзячы на антырэлігійныя кампаніі, згаданы вышэй кс. Ян Мяноўскі спавядаў у 1955 г. 413 жыхароў вёскі Вялікая Рагозніца [13, с. 82]. Усе крыніцы дадзенага падвіда паказваюць штодзённае жыццё невялікіх парафіяльных цэнтраў.

Не менш цікавай крыніцай з'яўляецца ліставанне святароў паміж сабой, а таксама з прыхаджанамі. У першай групе ліставання найбольшая частка лістоў з'яўляюцца просьбамі аб пацвярджэнні хрышчэння, змены канфесіі і г. д. Цікавым у дадзеным выпадку з'яўляецца дыскурс святароў, які пралівае святло на ўзаемаадносіны паміж імі. Звычайна ён выражаецца ў невялікіх сказах, зваротах, зычэннях, якія не ўласцівы афіцыйнай канцылярскай мове ў цэлым. Так, святар Веросскага праваслаўнага прыхода айцец Мікалай (прозвішча неразборліва) ў 1893 г. у перапісцы па пытаннях міжканфесійных пераходаў з Валкалацкім ксяндзом Юзафам Базыліем Генькам шчыра зычыў апошняму "…Святых таинств на Божественной Литургии…" [11, арк. 5 – 5 адв.]. Варта адзначыць, што ў ліставанні з іншымі святарамі айцец Мікалай падобны радок не дадаваў.

Цікавым з пункту гледжання гісторыі Касцёла ў савецкую эпоху выглядае ліставанне аднаго са святароў Шчучынскай парафіі, Станіслава Петраша, з прыхаджанамі ў 1962 г. на прадмет таго, што ён пераехаў у іншую парафію. Так, кс. Ст. Петраш выбачаўся перад жыхарамі Шчучына і з жалем казаў аб тым, што "…Уполномоченный р[елигиозных] культов Совета Министров БССР по Гродненской области отнял у меня регистрационную справку на Щучинский костёл. Уполномоченный заявил, что назначает меня настоятелем Каменского костёла. На мои возражения, как то …костёльное здание требует всяческого ремонта, а при моём состоянии здоровья работать очень трудно и может стать невозможным, Уполномоченный заявил, что если не стану работать в Каменском костёле, нигде на территории Гродненской области работы не получу…" [5, арк. 17].

Асобным відам гістарычных крыніц, якія захоўваюцца ў мясцовых касцёлах, з'яўляюцца запісы гамілій (польскамоўная назва – Kazania, або Nauka) за XIX – пачатак XX стст. Назва дадзенага тэрміна ў беларускамоўнай хрысціянскай тэрміналогіі паходзіць ад тэрміна "гамілетыка", якім абазначаецца мастацтва вядзення пропаведзяў і тлумачэння Святога Пісання. У XX ст. гаміліі сталі шмат у чым уніфікаванымі (гл. напрыклад: [3]), аднак у XIX ст. пробашчы парафій неаднаразова дадавалі нешта сваё ў тлумачэнне ўрыўкаў Святога Пісання. Так, у парафіяльным касцёле Св. Яна Хрысціцеля ў Валкалаце захавалася 10 звязак гамілій за 1854 – 1863 гг., якія агулам займаюць каля трох тысяч аркушоў. Фрагментарна дадзены від крыніц захаваўся ў парафіяльных установах у Жырмунах, Нясвіжы (за 1882, 1883 гг.) і шмат інш. Асабліва цікавымі з'яўляюцца гаміліі кс. Севярына Халімовіча, які нярэдка прыводзіў прыклады з мясцовага жыцця парафій, у якіх ён служыў, а таксама жыцця суседніх парафій. На простых прыкладах даводзіліся асноўныя дагматы веры, тлумачылася неабходнасць ухвалення тых ці іншых святых. Так, кс. Халімовіч распавядаў на адной з гамілій 1862 г. аб тым, як апосталы Павел і Пётр хадзілі па свету і неслі хрысціянскую веру іншаверцам, даруючы ім за правіны. Пасля ён звярнуўся да прыхаджан з заклікам таксама несці веру і дараваць усім правіны [12, арк. 8адв.].

Яшчэ адным відам гістарычных крыніц, якія адносяцца да эга-дакументаў, можна назваць надпісы на прыпераплётавых аркушах і кніжныя інскрыпцыі. Так, у вялікай колькасці парафій на сённяшні момант знаходзіцца дастаткова аб'ёмны масіў старадрукаванай тэалагічнай і мастацкай літаратуры за XVI – XX стст.

Сярод надпісаў, якія найбольш часта сустракаюцца, неабходна выдзеліць пазнакі "на памяць", чарнавікі метрычных кніг, даравальныя запісы, вершы, малітвы і г. д. Нажаль, большасць надпісаў немагчыма атрыбутаваць, аднак сустракаюцца такія, аўтары якіх устаноўлены. Так, цікавым з'яўляецца прыклад ужо згаданых у дадзеным артыкуле кс. Ю. Б. Генькі і Р. Дроніча. У шэрагу кніг Валкалацкай парафіяльнай бібліятэкі сустракаюцца вершаваныя творы невялікага памеру, запісаныя на вокладках і наклееных у кнігу аркушах паперы почыркам кс. Юзафа Базылія Генькі [1, арк. 1адв.]. Пры аналізе вядомых місалаў і канцыяналаў тэксты дадзеных твораў не сустракаліся, што дае магчымасць казаць аб тым, што кс. Генька або сам ствараў дадзеныя вершы і малітвы, або займаўся запісамі народнай творчасці.

Не меншую навуковую цікавасць выклікае шэраг кніг, якія асабіста належалі кс. Р. Дронічу. У некаторых з іх устрымліваюцца даравальныя надпісы ад удзячных парафіян, якія дзякавалі святару за неабыякавасць, актыўную духоўную і грамадскую дзейнасць. Так, касцельны камітэт Жодзішскай парафіі падараваў кс. Дронічу брэвіарый, які ён перавозіў з сабой падчас пераводу з аднаго касцёлу ў іншы [2, арк. 248]. У выніку, дадзенае выданне патрапіла ў парафію Св. Яна Хрысціцеля, якая была апошняй у святарскай дзейнасці памянёнага ксяндза (*у 1943 г. ён быў закатаваны фашыстамі*).

Такім чынам неабходна адзначыць, што эга-дакументы Рымска-каталіцкіх святароў уяўляюць сабой унікальны комплекс гістарычных крыніц, у якіх праз прызму рэлігійных усталёвак аналізуецца і адлюстроўваецца жыццё парафіяльных цэнтраў. Сярод праблем, якія аналізуюцца з дапамогай эга-дакументаў ксяндзоў, можна назваць нацыянальныя, дагматычныя, этнічныя пытанні, пытанні ўзаемаадносін паміж канфесіямі, а таксама паміж дзяржавай і Касцёлам і шмат інш. Спарадычнасць і

Рэпазіторый БДУ

выпадковасць знаходкі дакументаў падобнага тыпа сярод матэрыялаў парафіяльных архіваў робяць іх яшчэ больш каштоўным і ўнікальным апісаннем пэўных падзеяў гістарычнай рэальнасці.

1. Архіў парафіі Св. Яна Хрысціцеля, аг. Валкалата. – Cantionale ecclesiasticum Romano-catholicum, Thorun, 1811.
2. Архіў парафіі Св. Яна Хрысціцеля, аг. Валкалата. – Collectio Brevium at que instructionum, Apostolica, 1797.
3. Гамілії // Афіцыйны партал Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://catholic.by/3/liturgy/for-liturgy/homilies – Дата доступа: 15.02.2018.
4. Суднік, С. В. Ліда ва ўспамінах ксендза Гіпаліта Баярунца / С. В. Суднік // Лідскі Летапісец. – 2011. – № 54. – С. 31 – 34.
5. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 3С. Воп. 3. Спр. 5.
6. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 10.
7. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 11.
8. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 23.
9. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 3.16.
10. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 9.1.
11. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 12. Спр. 13.
12. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3С. Воп. Спр. 8.9.
13. Hlebowicz, A. Kościół w niewoli / A. Hlebowicz. – Warszawa: Głos, 1991. – 152 s.
14. Stasiewicz-Jasiukowa, I. Ksiądz Stanisław Rojek Sch. P. : biografia niezwyczajna niezłomnego kapłana kresowego w latach 1939-1996 / I. Stasiewicz-Jasiukowa. – Warszaw: Wydawnictwo Retro-Art, 2007. – 66 s.
15. Stasiewicz-Jasiukowa, I. Lidzanka. O Marii Stasiewiczowej – mojej Mamie – wspominienia. – Warszawa: Wydawnictwo Retro-Art, 2008. – 60 s.

## ИЗ ОБЛАСТИ «ЧИСТОЙ НАУКИ» – В ПОВСЕДНЕВНОСТЬ: СТАТИСТИЧЕСКИЕ ДАННЫЕ ГУБЕРНСКИХ КАЛЕНДАРЕЙ (НА ПРИМЕРЕ «ХАРЬКОВСКОГО КАЛЕНДАРЯ» НА 1869–1917 ГГ.)

А.Н. Янкул (Харьков, Украина)

В современную эпоху стремительного развития информационных технологий трудно представить повседневную жизнь без данных статистики. Она окружает нас практически повсюду: в новостях, на различных интернет-сайтах, в прессе, постоянно проводятся разнообразные социологические опросы, собираются данные, с которыми, как правило, может ознакомиться каждый желающий. Но статистика не всегда была доступной для интересующихся ею. Ещё в начале XIX в. на территории Российской империи доступ к ней имели по большей части люди, которые занимались обработкой собранных статистических сведений по тому или иному вопросу (как правило, это были учёные, действовавшие по программам Академии наук) и имели отношение к высшим правительственным сферам. И только во второй половине XIX в., после падения крепостного права, подробные статистические данные начинают активно публиковаться в печатных изданиях. Их сборами и обработкой занимались созданные в 30-е гг. XIX в. губернские статистические комитеты.

Цель работы – рассмотреть вопрос, как статистические данные стали частью повседневной жизни губерний во второй половине XIX – в начале XX в. на примере Харьковской. В фокусе нашего внимания находится её центральный информационно-статистический ежегодник – «Харьковский календарь».

Нами использовались следующие методы: общенаучные – анализа и синтеза, специальные – историко-сравнительный и историко-генетический. При помощи данных методов были проанализированы разделы «Харьковского календаря», посвящённые статистике и прослежена их эволюция в плане расширения информативной части сборника за весь долгий период его публикации.

Источниковую базу работы составляют выпуски информационно-статистического сборника «Харьковский календарь» на 1869–1917 гг. [11], а также его предшественника – «Памятной книжки Харьковской губернии» (1862–1868 гг.) [7], материалы Государственного архива Харьковской области [2].

В первой половине XIX ст. в Харькове выходило несколько изданий, которые не отличались долголетием своего существования. Некоторые из них стали первыми в Украине сборниками, альманахами и т. д. [3 и др.] Наиболее прочно утвердившейся среди них стала газета-официоз «Харьковские губернские ведомости» (1838–1917 гг.). В отдельных таких изданиях спорадически появлялись статистические данные, касавшиеся как империи в целом, так и Харьковской (до 1835 г. – Слободско-Украинской) губернии.

Мощным толчком для развития статистики на Слободской Украине стало открытие в 1805 г. университета в Харькове – первого на украинских землях в составе Российской империи. В университете возникли кафедры, которые специально занимались статистикой. В том числе, по Уставу 1804 г. в состав словесного отделения входили кафедры всемирной истории, статистики и географии, а также кафедра истории статистики и географии Российского государства [4, с. 5]. Не удивительно, что среди выпускников университета оказались такие блестящие статистики, как П. И. Кеппен (1793–1864), автор капитальных статистических исследований [см., например: 6 и др.], который в 1845 г. возглавил отделение статистики Российского географического общества [8, с. 133].

О внимании университетской общественности к статистике свидетельствует избрание почётными членами не только отечественных учёных, но и таких выдающихся зарубежных статистиков, как А. Моро де Жоннес



Репозиторий ВГУ